МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ П.М. МАШЭРАВА»

Філалагічны факультэт

Кафедра літаратуры

Дапушчана да абароны

«08» 06 2017г.

Загадчык кафедры

______ Лапацінская В.В

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ

# КАРАТКЕВІЧАЗНАЎСТВА: НАБЫТКІ, СУЧАСНЫ СТАН, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Спецыяльнасць 1-21 80 10Літаратуразнаўства.

Бардзюкова Маргарыта Васільеўна,

Абарона 26.06.2017г.

Адзнака 9 (дзевяць)

Навуковы кіраўнік:
Русілка Вольга Іванаўна,
дацэнт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Віцебск, 2017

**Рэферат**

Магістарская дысертацыя 73 с., 95 крыніц.

МАНАГРАФІЯ, ЛІТАРАТУРНА-КРЫТЫЧНЫ АРТЫКУЛ, ІДЭЙНА-МАСТАЦКАЯ І ЖАНРАВАЯ СПЕЦЫФІКА ПРОЗЫ, ПАЭЗІЯ, ДРАМА І ПУБЛІЦЫСТЫКА Ў СУЧАСНЫМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ, ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ТВОРА Ў МАСТАЦТВЕ.

*Аб'ектам* даследавання выступаюць тэарэтычныя і літаратурна-крытычныя даследаванні па творчасці Уладзіміра Караткевіча.

*Прадметам* даследавання з'яўляецца сучасны стан і перспектывы развіцця караткевічазнаўства.

*Мэта* даследавання: вызначэнне заканамернасцяў і перспектыўных напрамкаў развіцця сучаснага караткевічазнаўства.

*Метады даследавання*: апісальны, супастаўляльны, параўнальны, кампаратыўны з элементамі кантрастыўнага.

*Элементы навізны:* праведзена сістэматызацыя матэрыялу і вызначаны перспектыўныя напрамкі далейшых пошукаў.

*Вынікі ўкаранення:* работа выкарыстана ў навучальным працэсе на кафедры літаратуры ВДУ ім. П.М. Машэрава.

*Тэарэтычная і практычная значнасць* працы заключаецца ў магчымасці яе выкарыстання ў межах дысцыплін "Гісторыя літаратурнай крытыкі" і "Гісторыя беларускай літаратуры XX – XXI ст.".

**Змест**

Уводзіны ... 4

1 Ідэйна-мастацкая і жанравая спецыфіка прозы Уладзіміра Караткевіча ў літаратуразнаўчых даследаваннях ... 8

2 Асэнсаванне паэзіі У. Караткевіча ў сучасным літаратуразнаўстве ... 24

3 Асэнсаванне сучаснікамі драматычнай спадчыны У. Караткевіча ... 44

4 Ацэнка публіцыстычнай спадчыны Караткевіча ў сучасным караткевічазнаўстве ... 51

5 Уладзімір Караткевіч і мастацтва ў асэнсаванні літаратуразнаўцаў ... 55

Заключэнне ... 60

Спіс выкарыстаных крыніц ... 63

**Уводзіны**

Прозвішча Уладзіміра Караткевіча трывала ўвайшло ў гісторыю літаратуры – беларускай, усесаюзнай, усеславянскай. Ён прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне XX стагоддзя і зведаў на ўласным лёсе ўсе асаблівасці той гістарычнай эпохі. На пачатку XXI яго заслужана называюць знакавым беларускім мастаком, "улюбёным" пісьменнікам шматлікіх чытачоў зямлі, якая мроілася яму "пад белымі крыламі". Уладзімір Караткевіч арганічна засвоіў вопыт беларускай і сусветнай культур. І змог сказаць сваё, адметнае слова, істотна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў ідэйна-тэматычных і жанрава-стылёвых адносінах, напоўніў яе інтэлектуальным і філасофскім зместам. Меў энцыклапедычныя веды, быў таленавітым мастаком, цудоўным спеваком, выдатным апавядальнікам, здольным артыстам і моцна любіў Беларусь. Энцыклапедычную дасведчанасць Уладзіміра Караткевіча прыкмеціў яго сябар Рыгор Барадулін: "Ты ведаў як мала хто шмат, Ты штохвіліны імкнуўся даведацца яшчэ болей, дапасці да сутнасці, да першавытокаў сэнсу ўсяго нашага вокамгненнага зямнога бытавання – жыцця" [73, с. 344].

Уладзімір Караткевіч шмат зрабіў для развіцця адраджэнскіх ідэй, для абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў. Пра яго, пачынаючы з сярэдзіны 50-х гадоў, ужо нямала напісана. З'явіліся кнігі Анатоля Вераб'я "Жывая повязь часоў: нарыс творчасці У. Караткевіча" (1985), "Абуджаная памяць: нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча" (1977), "Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць" (2005), Адама Мальдзіса "Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча" (1990), Аркадзя Русецкага "Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць" (2000), Вольгі Шынкарэнкі "Пад ветразем дабра і прыгажосці" (1995). Караткевіч прызнаваўся: "Як ні дзіўна, я не хацеў быць літаратарам. Вершы пісаў для сябе. А ў будучым хацеў быць літаратуразнаўцам" [51, с. 3]. Пра сур'ёзнасць і шматграннасць навуковых інтарэсаў Караткевіча сведчаць праблемы, якімі ён займаўся ў студэнцкія гады: "Багдановіч і сучаснасць", "Моўная стыхія Пушкіна", "Беларускія і ўкраінскія школьныя драмы" і іншыя [14, с. 356].

Уладзімір Караткевіч – адзін з яркіх і адначасова загадкавых беларускіх пісьменнікаў другой паловы XX стагоддзя. Здавалася б, ён такі просты, светлы і чысты, а на самой справе гэта надзвычай складаны для асэнсавання мастак, бо ў яго творчасці шмат нечаканасцей і таямніц. У. Караткевіч бачыў ідэальнае і прыгожае ў жыцці і чалавеку. Р. Барадулін трапна ацаніў сутнасць Караткевіча: "Дзіця з вачыма празарліўца". Героі твораў, як і сам аўтар, былі маральна чыстымі, даверлівымі, адкрытымі, захопленнымі жыццём і адначасова мудрымі, засяроджанымі ў сабе, трагічнымі і гняўлівымі, моцна ўлюбёнымі ў родную зямлю [73, с. 345].

Слова У. Караткевіча ёмістае і глыбокае. Сам Караткевіч – увасабленне нацыянальнага, беларускага. На думку Алега Лойкі, творчасць Караткевіча была не толькі выявай духу. У ёй яшчэ было ўзвелічэнне беларускай шляхты і беларускага мужыка, "як і выявы самога характару Караткевіча як дзеяча гісторыі, культуры Беларусі, беларускага народа". Слушна сцвярджаецца, што "Уладзімір Караткевіч – беларус да мозга касцей – гэта перш за ўсё" [73, с. 8]. Ён знаходзіўся ў цэнтры беларускага культурнага і навуковага жыцця, выступаў у абарону беларускай мовы, культуры, помнікаў архітэктуры і прыроды. Творчасць пісьменніка прыкметна ўплывае на сучасны літаратурны працэс. Дзякуючы яму назіраецца павышаная зацікаўленнасць беларускіх літаратараў мінулым роднага краю. Караткевіч быў сапраўдным апосталам духоўнасці, прадвесцем новага беларускага Адраджэння. Пісьменнік здолеў дасканала раскрыць душу народа і яго нацыянальны характар.

Караткевіч паспеў сцвердзіць сябе і ў паэзіі, і ў прозе, і ў драматургіі для тэатра, кіно і оперы, і ў публіцыстыцы, і ў крытыцы, і ў літаратуры для дзяцей, і як перакладчык. І ўсюды ён выступаў з бляскам, даючы не толькі добрыя, але і выдатныя рэчы. Ягоны пасмяротна выдадзены "Збор твораў" складаецца з дзесяці ёмістых кніг. Але і яны не ахопліваюць усяго, што напісаў гэты апантаны працаўнік, які ўяўляецца рамантычным рыцарам чалавечнасці. Такім ён быў і ў рэальным жыцці, і ў сваёй творчасці, хоць сам рашуча адмаўляў яе рамантычны характар. "Я не пісьменнік рамантычнага складу. Хто хоча, каб я яго паважаў, – хай аддасць гэта азначэнне, гэты ярлык у архіў", – настойваў пісьменнік у інтэрв'ю Т. Шамякінай [13, с. 157]. Аб гэтым жа гаварыў ён і ў сваіх запісных кніжках, і ў лістах да ўкраінскага

сябра, празаіка Рамана Іванычука, і ў вусных гутарках-спрэчках з Вячаславам Адамчыкам, называючы сябе суровым рэалістам. “Не рамантык я! Я – рэаліст. Я так бачу жыццё і пішу толькі праўду”, – занатаваў яшчэ адно рашучае выказванне Караткевіча У. Калеснік [13, с. 158]. Гэты выдатны даследчык блізка сябраваў з пісьменнікам, дасканала ведаў яго самога і ягоную творчасць і таму пераканана сцвярджаў: “Караткевіч – рамантык ва ўсім, нават у катэгарычным адмаўленні рамантычнай прыроды свайго таленту”. “Адмяжоўваючыся ад абрыджанага дагматыкай рамантызму, паэт у душы і ў слове заставаўся ваяўнічым рамантыкам”, – настойваў Калеснік [13, с. 158].

Творы Уладзіміра Караткевіча вучаць любіць Радзіму, берагчы чалавечнае ў чалавеку, паглыбляюць веды пра зямлю, на якой мы жывём, выклікаюць радасць мастацкага адкрыцця, абуджаюць, хвалююць, трывожаць фантазію і розум. Творчасць У. Караткевіча – гэта мастацкі летапіс жыцця беларускага народа, напісаны шчыра і таленавіта [14, с. 255].

*Актуальнасць* дадзенай працы заключаецца ў тым, што ўзнікае неабходнасць асэнсаваць і абагульніць вялікую колькасць даследаванняў па творчасці У.Караткевіча.

*Аб’ектам* даследавання выступаюць тэарэтычныя і літаратурна-крытычныя даследаванні па творчасці Уладзіміра Караткевіча.

*Прадметам* даследавання з’яўляецца сучасны стан і перспектывы развіцця караткевічазнаўства.

*Мэта* даследавання: вызначэнне заканамернасцяў і перспектыўных напрамкаў развіцця сучаснага караткевічазнаўства.

Каб дасягнуць мэты, неабходна вырашыць наступныя *задачы*:

1. Сістэматызаваць існуючыя ў літаратуразнаўстве тэарэтычныя і літаратурна-крытычныя даследаванні па творчасці У. Караткевіча.

2. Вылучыць маладаследаваныя аспекты творчасці У. Караткевіча.

3. Паказаць узаемасувязь літаратурна-крытычных ацэнак творчасці У. Караткевіча і вядучых тэндэнцый літаратурнага працэсу пэўнага перыяду.

4. Параўнаць ацэнку творчасці Караткевіча ў беларускім і замежным літаратуразнаўстве.

5. Паказаць спецыфіку адлюстравання творчасці Караткевіча ў іншых відах мастацтва.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Абола, М. Неугасимый свет доброй, благородной души / М. Абола // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 105 – 108.
2. Амельчанка, М. Кароль духоўнасці / М. Амельчанка // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 202 – 207.
3. Арочка, М. Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 231 с.
4. Бажок, І. Жанр эсэ ў творчасці Уладзіміра Караткевіча / Ірына Бажок // Роднае слова. – 2014. – № 8. – С. 15-19.
5. Банцэвіч, П.К. Адлюстраванне праблемы сацыякультурнай памяці ў творчасці Уладзіміра Караткевіча / П. Банцэвіч // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 9-12.
6. Банцэвіч, П.К. Актуалізацыя біблейскіх матываў у творчасці У. Караткевіча: культуралагічны аспект / П.К. Банцэвіч // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2009. – № 2. – С. 99-102.
7. Банцэвіч, П.К. Нацыянальная эліта ў ідэйным змесце творчасці Уладзіміра Караткевіча: культуралагічны аспект / П. Банцэвіч // Роднае слова. – 2009. – № 5. – С. 100-102.
8. Банцэвіч, П.К. Творчасць Уладзіміра Караткевіча ў кантэксце культуралогіі: манагр. / П.К. Банцэвіч. – Гродна: ГДАУ, 2007. – 310 с.
9. Бармоціна, А. Гістарычныя драмы Уладзіміра Караткевіча / Алена Бармоціна // Роднае слова. – 2012. – № 4. – С. 20-22.
10. Бароўка, В.Ю. Мастацкі этнаграфізм у апавяданні У. Караткевіча “Калядная рапсодыя”: семантыка-функцыянальны план // Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння:

матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі / рэд. калегія: В.А. Максімовіч [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 77-82.

11.Бароўка, В.Ю. Постаці дзеячаў беларускай культуры ў лірыцы Уладзіміра Караткевіча / Ванда Бароўка // Роднае слова. – 2016. – № 6. – С. 11-13.

12.Берестень, С. Послушав "Паром на бурной реке" / С. Берестень // Знамя юности. – 1982. – 2 июля. – С. 8.

13.Бугаёў, Д. Рамантычны рыцар чалавечнасці / Дзмітрый Бугаёў // Полымя. – 2000. – № 11. – С. 157-160.

14.Быў. Ёсць. Буду!: успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. – Мінск: Маст. літ., 2005. – 517 с.

15.Вашчыліна, В. Вобраз аўтара – вобраз апавядальніка: кампазіцыйныя тыпы мастацкіх тэкстаў Уладзіміра Караткевіча / Віялета Вашчыліна, Таццяна Старасценка // Роднае слова. – 2014. – № 4. – С. 54-58.

16.Верабей, А.Л. Абуджаная памяць: нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча. – Мінск, 1997. – 256 с.

17.Верабей, А.Л. Жывая повязь часоў: нарыс творчасці У. Караткевіча / А.Л. Верабей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 119 с.

18.Верабей, А.Л. Мастацкае адлюстраванне гісторыі ў рамане У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" / А.П. Верабей // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 1. – С. 72-85.

19.Верабей, А.Л. Творчасць Уладзіміра Караткевіча: матэрыялы да ўрока – лекцыі / А.Л. Верабей // Беларуская мова і літаратура. У дапамогу педагогу. – 2005. – № 8. – С. 21-31.

20.Верабей, А.Л. Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А.Л. Верабей. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 271 с.

21.Верабей, А. Фальклорныя матывы ў творчасці Уладзіміра Караткевіча: [літ.крытыка] // Роднае слова. – 2006. – № 7. – С. 18-20.

22.Гайдук, М. Гістарычныя візіі Уладзіміра Караткевіча / М. Гайдук // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы

зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 222 – 223.

23.Ганчарова-Цынкевіч, Т. Духоўны свет чалавека і каардынаты часу ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча / Таццяна Ганчарова-Цынкевіч // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 13 – 14.

24.Гарадніцкі, Я. Суб’ект лірычнага дыскусу і формы яго ўвасаблення [на прыкладзе паэзіі У. Караткевіча] / Яўген Гарадніцкі // Беларускае літаратуразнаўства: навукова-метадычны зборнік / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – Мінск, 2007. – Вып. 5. – С. 41 – 47.

25.Герцовіч, Я. Шукаць у рэальным жыцці / Я. Герцовіч // Літаратура і мастацтва. – 1971. – 25 чэрвеня. – С 10.

26.Грамадчанка, Т. “Горда рабіць сваю справу...”: штрыхі да юбілейнага партрэта Уладзіміра Караткевіча / Таіса Грамадчанка // Роднае слова. – 2010. – № 11. – С. 3 – 8.

27.Грушэцкі, А. Душа і сэрца Беларусі: [пра пісьменніка У. Караткевіча] / А. Грушэцкі // Настаўніцкая газеты. – 2014. – 29 ліпеня. – № 89. – С. 24.

28.Давыдоўская, Н.А. Фаўст эпохі НТР: вобраз Севярына Будрыса ў аповесці “Чазенія” У. Караткевіча: [літ.крытыка] // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка, псіхалогія, філалогія. – 2006. – № 2. – С. 95-98.

29.Давыдоўская, Н. Эсхаталагічная канцэпцыя рамана У. Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў гародні” / Н. Давыдоўская // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – 2008. – № 6, Ч. 1. – С. 69 – 74.

30.Даніленка, С.І. Асаблівасці нацыянальнай гісторыі ў прозе Уладзіміра Караткевіча: [літ.крытыка] // Вестник Минского государственного лингвистического университета. Серия 1. Филология. – 2006. – № 2. – С. 219-224.

31.Жабінская, М. Спадчына Караткевіча – крыніца агульнага гуманізму / М. Жабінская // Наша слова. – 2005. – 14 снежня. – С. 8.

32.Жаўняровіч, П.П. Публіцыстыка Уладзіміра Караткевіча / П.П. Жаўняровіч // Беларуская мова і літаратура. – 2005. – № 3. – С. 51-55.
33.Іванычук, Р. Мой рэквіем / Р. Іванычук // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 227 – 232.
34.Ішчанка, Г.М. Аповесць У. Караткевіча "Чазенія" ў кантэксце творчасці пісьменніка 60-х гадоў ХХ стагоддзя / Г.М. Ішчанка //Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2011. – № 1. – С. 71-75.
35.Каламійцава, Ю.А. Творчасць як экзістэнцыянальны модус быцця ў рамане У. Караткевіча "Нельга забыць" // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 7. – С. 154-157.
36.Каламійцава, Ю.А. Экзістэнцыянальныя матывы ў творчасці У. Караткевіча на прыкладзе аповесці "Ладдзя роспачы" // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 164-168.
37.Караткевіч, У. У дарозе і дома: з запісных кніжак / У. Караткевіч // Полымя. – 1989. – № 1.– С. 57-59.
38.Киселёв Г. О романе "Колосья под серпом твоим" и его авторе / Г. Киселёв // Минск, 1979. – 247 с.
39.Конан, І. Нацыянальная гуманістычная ідэя ў рамане "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" Уладзіміра Караткевіча: [літ.крытыка] // Роднае слова. – 2007. – № 3. – С. 6-7.
40.Крыжанава-Брындзава, Г. Наш дарагі сябра / Г. Крыжанава-Брындзава // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 219 – 221.
41.Лапіцкая, Т.В. Вывучэнне нарыса У.Караткевіча "Зямля пад белымі крыламі" / Т.В. Лапіцкая // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 4. – С. 32-37.

42.Лаппо, М. Мастацкі час і прастора ў рамане У. Караткевіча "Леаніды не вернуцца да Зямлі" / М. Лаппо // Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка. – 2016. – № 3. – С. 16-20.
43.Лаппо, М. Сацыякультурныя рэаліі XX ст. і мастацкая прастора рамана "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" Уладзіміра Караткевіча / Марыя Лаппо // Роднае слова. – 2016. – № 4. – С. 16-19.
44.Літвінава, Ю. Сатыра і гумар у паэзіі Уладзіміра Караткевіча: [літ.крытыка] // Роднае слова. – 2006. – № 12. – С. 18-20.
45.Лойка, А. Выхаванне таленту / А. Лойка // Маладосць. – 1961. – № 7. – С. 143 – 146.
46.Локун, В. У пошуку маральнага ідэалу: проза Уладзіміра Караткевіча / В. Локун // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 35 – 37.
47.Лупакоў, У.Э. Рэлігійная тэма ў творчасці Уладзіміра Караткевіча / У. Лупакоў // Роднае слова. – 2011. – № 4. – С. 19-20.
48.Лявонава, Е. Біблейскія алюзіі ў творчасці Уладзіміра Караткевіча: [літ.крытыка] // Полымя. – 2007. – № 3. – С. 183-187.
49.Лявонава, Е. Прысутнасці Гётэ ў творах Караткевіча / Е. Лявонава // Маладосць. – 2014. – № 7. – С. 80-84.
50.Ляўковіч, А. "Усе шляхі прыводзяць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз…" / А. Ляўковіч // Звязда. – 2000. – 15 жніўня. – С. 3.
51.Мак-Мілін, А. "Быў. Ёсць. Буду…". Гісторыя і культура як тэмы паэзіі Уладзіміра Караткевіча / А. Мак-Мілін // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 208 – 218.
52.Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: Партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.
53.Мельнікава, А. Выявай духу будзе творчасць Караткевіча / А. Мельнікава // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 13 студзеня. – С. 5.

54.Мішчанчук, М.І. Лірыка У. Караткевіча ў кантэксце мадэрнісцкіх пошукаў літаратуры XX стагоддзя // Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі / рэд. калегія: В.А. Максімовіч [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 358-363.
55.Мяснікоў, А. Уладзімір Караткевіч (1930 – 1984) // Сто асоб беларускай гісторыі: гіст. партрэты / А. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – 546 с.
56.Навіцкая, В. Кантраст як стылёвая дамінанта ранняга казачнага эпасу Уладзіміра Караткевіча / В.Навіцкая // Роднае слова. – 2013. – № 8. – С. 15-17.
57.Навіцкая, В. Уладзімір Караткевіч і Ян Баршчэўскі: характар мастацкай інтэрпрэтацыі пісьменнікамі народнага эпасу / Валянціна Навіцкая // Полымя. – 2013. – № 8. – С. 110-115.
58.Нарынкевіч, Н.В. Нацыянальная ідэя ў публіцыстыцы Уладзіміра Караткевіча / Наталля Вячаславаўна Нарынкевіч // Веснік БДУ. Сер. 4. Філалогія, журналістыка, педагогіка. – 2006. – № 2. – С. 107-112.
59.Ненадавец, А.М. Уладзімір Караткевіч: прырода, фальклор і творца / А.М. Ненадавец. – Бабруйск, 2006. – 240 с.
60.Полаўцава, І. Мастацкая праўда і праўда гісторыі ў рамане У. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" / І. Полаўцава // Классика и современность: сборник научных трудов молодых учёных-филологов / Министерство образования Республики Беларусь, Брестский государственный университет им. А.С. Пушкина. – Брест, 2009. – С. 98 – 100.
61.Пракофьева, В. Мастацкі свет рамана У. Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні": аўтарэф. дыс. ...доктар філалагічных навук / В. Пракофьева. – Даўгавпілс, 2016. – 9 с.
62.Прашковіч, Л.І. Беларускае Сярэднявечча ў кантэксце рамана У. Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" / Л.І. Прашковіч // Вобразна-эстэтычны аспект нацыянальнай мастацкай свядомасці: зборнік навуковых артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. І.П. Шамякіна. – Мазыр, 2009. – Вып. 5. – С. 45 – 55.

63.Радомская, Л. “Тут стаў я сынам краіны…”: Уладзімір Караткевіч і Орша / Л. Радомская // Роднае слова. – 2000. – № 10. – 150 с.
64.Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – 300 с.
65.Садаўнічы, Э. Ідэйны сэнс і яго мастацкае ўвасабленне ў п’есе Уладзіміра Караткевіча “Званы Віцебска” / Э. Садаўнічы // Беларуская літаратура. Міжвед. зборнік. Вып. 19. – Мінск: Універсітэцкае, 1991. – С. 87 – 98.
66.Сасімовіч, А.К. “Рамантычны рыцар чалавечнасці” / А.К. Сасімовіч // Беларуская мова і літаратура. – 2015. – № 11. – С. 57-64.
67.Сіпакоў, Я. “Між Дняпром і крыкам жураўліным…” / Я. Сіпакоў // Літ. і мастацтва. – 1986. – 5 верас. – С. 10.
68.Старасценка, Т. Моўная асоба Уладзіміра Караткевіча / Таццяна Старасценка // Роднае слова. – 2011. – № 10. – С. 49.
69.Стрыкава, А. Паэтыка рамантызму ў аповесці Уладзіміра Караткевіча “Чазенія” / Алена Стрыкава // Беларускае літаратуразнаўства: навукова-метадычны зборнік, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – Мінск, 2009. – Вып. 7. – С. 75 – 77.
70.Сцяпанава, А. Рысы еўрапейскага постмадэрнізму ў творах Уладзіміра Караткевіча / А. Сцяпанава // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 58 – 62.
71.Томашава, С. “Беларуская песня”. Уладзімір Караткевіч / С. Томашава // Роднае слова. – 2013. – № 10. – С. 67 – 69.
72.Уладзіміраў, С. Шукальнік вечнага / С. Уладзіміраў // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 193 – 196.

73. Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы: зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў / уклад.: А. Верабей, М. Панізнік. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2010. – 368 с.
74. Улащик, Н. Отзыв на рукопис романа Владимира Короткевича “Колосья под серпом твоим” / Н. Улащик // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 197 – 201.
75. Ушкевіч, П. Міфалагема культурнага героя ў творчасці Уладзіміра Караткевіча / Павел Ушкевіч // Роднае слова. – 2011. – № 6. – С. 25 – 27.
76. Федзюкова, Т.А. Каларыт, атмасфера мінулага ў аповесці У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха” / Т.А. Федзюкова // Беларуская мова і літаратура. Серыя “У дапамогу педагогу”. – 2015. – № 3. – С. 37-39.
77. Хвашчэўская, Л. Гукавыя вобразы ў паэзіі У. Караткевіча, створаныя сродкамі гукапісу / Л. Хвашчэўская // Труды молодых специалистов Полоцкого государственного университета / Министерство образования Республики Беларусь, Полоцкий государственный университет. – Новополоцк, 2010. – Вып. 42: Гуманитарные науки. – С. 177 – 179.
78. Хелемский, Я. Запомним и это / Я. Хелемский // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 245 – 246.
79. Цімафейчык, Г. Уладзімір Караткевіч. Жыццё і творчасць пісьменніка. Аповесць “Дзікае паляванне караля Стаха” / Ганна Цімафейчык // Роднае слова. – 2012. – № 5. – С. 70 – 74.
80. Чабан, Т. Крылы рамантыкі / Т. Чабан. – Мінск: Навука і тэхніка, 1982. – 256 с.
81. Чарнышова, Л.В. Адлюстраванне народных і хрысціянскіх уяўленняў пра змяю ў рамане Уладзіміра Караткевіча “Хрыстос прызямліўся ў Гародні” // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. – 2007. – № 7. – С. 27-32.

82.Шавель, А.І. Уласныя імёны ў рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” / А.І. Шавель // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 12. – С. 45.
83.Шапкова, І. Узыходжанне да “Каласоў...”: жыццёвы і творчы шлях Уладзіміра Караткевіча: урок беларускай літаратуры (10-ты клас) / І. Шапкова // Роднае слова. – 2015. – № 11. – С. 34 – 37.
84.Штэйнер, І. “Свет шчодры. Свет мяне паўторыць...”: паэзія У. Караткевіча і класічныя традыцыі / І. Штэйнер. – Мінск: Кнігазбор, 2008. – 120 с.
85.Шчадрына, В. Як у Маскве выйшлі “Каласы пад сярпом тваім” / В. Шчадрына // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 63 – 66.
86.Шынкарэнка, В. Нацыянальнае і агульначалавечае ў паэтычнай сістэме Уладзіміра Караткевіча / В. Шынкарэнка // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2000. – С. 53 – 57.
87.Шынкарэнка, В. Нястомных пошукаў дарога. Праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы. – Мінск. – 2002. – 216 с.
88.Шынкарэнка, В.К. Пад ветразем дабра і прыгажосці: Жанрава-стылявыя асаблівасці прозы У. Караткевіча. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 175 с.
89.Шынкарэнка, В. Сучасная гістарычная проза і творчасць У. Караткевіча / В. Шынкарэнка // Беларуская літаратура. Міжвед. зборнік. Вып. 19. – Мінск: Універсітэцкае, 1991. – С. 81 – 87.
90.Юркевіч, Г. Уладзімір Караткевіч і Орша / Галіна Юркевіч // Полымя. – 2010. – № 11. – С. 184 – 188.
91.Ярош, М. Беларуская савецкая лірыка / М. Ярош. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 205 с.
92.Яскевіч, А. Вершы Уладзіміра Караткевіча / А. Яскевіч // Полымя. – 1992. – № 6. – С. 15 – 18.
93.Gimpelevich-Schwartzman, Z. Uladzimir Karatkievic and his influence on the contemporary Byelorussian renaissance / Z. Gimpelevich-Schwartzman //

Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 233 – 241.

94. Niedziela, Z. Podróże sentymentalne do Minska / Z. Niedziela // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 83 – 85.

95. Zidlicky, V. Uladzimir Karatkevic / V. Zidlicky // Уладзімір Караткевіч і яго творчасць у еўрапейскім культурным кантэксце: Навуковы зборнік / Рэдкал.: А. Мальдзіс і інш. – Мінск: "Беларускі кнігазбор", 2000. – С. 256 – 258.